■ Хто каго?

# ...У ГУСАКА ЁСЦЬ ЖОНКА, ДЗЕЦІ, КОТ — СПРАДВЕКУ ХАЛАСЦЯК

**«Сямёра аднаго не чакаюць», — сказалі медсёстры і пачалі аперацыю без хірурга.**
**Вось і мы пачнём — чарговы агляд конкурснай пошты. З чаго? Ды, як заўжды, відаць, — з анекдотаў: пра ката (і галоўнага героя нашага здымка) іх вялікае мноства. «Бабулечка, — просіць унук, — дай мне швабру. — А навошта яна, дзіцятка? — Ды хачу коціка з-пад канапы паклікаць»...**
**Магчыма, ён якраз, той «пакліканы», потым выпадкова абнюхаў сэнсарны тэлефон і тым самым, паводле анекдота, зрабіў 3 здымкі, адправіў 5 эсэмэсак і выклікаў нарад міліцыі... Бо яно ж і сапраўды: нюх у ката — яшчэ той! А ўжо язык... Ён — не толькі язык, але і (лічыце) лыжка, кубак, зубная шчотка, шчотка для футра, мыла, вяхотка і туалетная папера.**
**Хопіць? Ці яшчэ адзін? Тады апошні: кот, пачуўшы, што ў госці да гаспадыні прыйшла сяброўка з дзецьмі трох і сямі гадоў, тут жа прыкінуўся мёртвым.**



Зрэшты, вось гэта — можа, не анекдот ужо? Можа, гатовы подпіс да здымка (кінулі вокам?)? Згадзіцеся, добры варыянт! Самы час тады пазнаёміцца з іншымі. Вось што піша, прынамсі, **спадар Анатоль Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна:**

*Бітон на лаўцы гэтай бачым*
*І трохлітровік з першаком,*
*Таму ёсць думка,*
*што няйначай*
*Гулялі кот тут з гусаком.*
*І хоць таго мы не прыкмецім,*
*Хто ў каго быў у гасцях,*
*Ды ў гусака ёсць жонка, дзеці,*
*А кот — спрадвеку халасцяк.*

Мае рацыю спадар Анатоль — праўду піша, але, як прызнаюць **сужэнцы Астроўскія з Мінска,** не ўсю:

*Спіць на сонцы кот-лайдак,*
*Бо… накраў сабе катлетак.*
*А гусак — жыве не так,*
*Не таму ён вучыць дзетак!*

Ён, бацька, на думку **спадара Васіля Пяшэвіча з вёскі Юркевічы Жыткавіцкага раёна,** падчас «фотасесіі» якраз прамаўляў (каб малыя пачулі):

*— Гэта ж ганьба —*
*так набрацца!..*
*З п'яным — лепей нам*
*не знацца.*
*Кругам дзеткі, за вярсту,*
*Каб не трапіцца кату!*

Гусі, значыць, птушкі разумныя, яны не рызыкуюць. А вось кот — яшчэ і як: і тым, што выпівае, і тым, што потым валяецца абы-дзе… Дабром такое наўрад ці скончыцца. Што не можа не хваляваць — прынамсі, **спадара Міколу Кісяля з Мінска.** І таму ён кажа «герою»:

*До валяцца на дарозе —*
*Падвяргаць жыццё пагрозе,*
*Ды гусей чужых смяшыць…*
*Трэба, брат, за розум брацца,*
*Можа, ў вузел завязацца,*
*Але ж неяк кінуць піць!*

Кінуць — пакуль не позна!

Трывогай за жыццё хатніх гадаванцаў прасякнуты і радкі **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў:**

*Слоік з нечым… І біклага…*
*У ёй вада была ці брага?*
*Што каток пакаштаваў?*
*Ці не дуба, бедны, даў?*
*Гаспадар дзе?*
*Спіць начамі?*
*Тое ж будзе і з гусямі.*

Цьфу-цьфу-цьфу: пастукаем па лбе (найбліжэйшае «дрэва»)… Але ж гаспадарка і сапраўды вымагае клопату (падчас — без перапынкаў на сон ды на абед), вымагае нялёгкай працы:

*Як у нашае Марусі*
*У хляве кароўка, гусі,*
*У суседачкі — Аўгінні —*
*Конік ёсць, каток і свінні…*
*А бяда у іх адна —*
*Муж не робіць ні…*

Па-беларуску і мякка скажам: анічога, — вось што крыўдна **спадарыні Любові Чыгрынавай з вёскі Забалацце Вілейскага раёна!** І каб толькі ёй, а то… Паводле анекдота, муж сказаў, што паправіць загарадку, значыцца, паправіць! І не трэба яму напамінаць пра гэта кожныя паўгода!

Зрэшты, мы ж не пра мужчын як быццам гамонку вядзём, мы (вуснамі **спадара Кісяля**) — пра катоў:

*У гусей не шлункі — прорва!*
*Хто падкажа, чым карміць?*
*Паўбітона было корму —*
*Мышы з'елі…*
*Васька — спіць…*

А ўсё чаму? І хто вінаваты? Адказ на гэтыя пытанні ў… байцы — ад **спадара Сцяпана Нефідовіча з вёскі Любань Лунінецкага раёна:**

*Дырэктарам ката*
*абралі гусі —*
*Ён тут жа перастаў*
*лавіць мышэй…*
*Хацелі*
*кіраваць яго прымусіць,*
*Ды выйшла,*
*што сабе ж і даражэй…*
*Спужаліся:*
*цяпер, як Вася, спаць,*
*Не могуць*
*нават голасу падаць…*
*І ўжо змірыліся —*
*прывыклі гэтак жыць,*
*А кот сабе нап'ецца*
*ды ляжыць.*

Бо — гаспадар (паводле **спадара Пяшэвіча**):

*Выхваляўся кот па праву,*
*Што стварыў сабе дзяржаву:*
*Малаком адліў мяжу —*
*Дзе хачу, там і ляжу…*

Шчаслівы, трэба разумець — яшчэ і наступствамі:

*Васька ў доме — гаспадар,*
*Над усімі ўладар!*
*Трэба, значыць, дагаджаць*
*Трэба ўвагай акружаць:*
*…Карагодам ходзяць гусі —*
*Спі, панове, мусі-пусі…*

Гэту «як быццам» калыханку кату са здымка прыдумала **спадарыня Соф'я Кусянкова з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна.** Яна — не вам казаць — можа. **Спадар Яўген Васілеўскі з Гомеля,** як сам прызнаецца, — не, бо:

*Сам я клёку не прыдбаў, —*
*Ды сказалі гусі ўсе:*
*Гнаў гарэлку гаспадар,*
*А каток — нанюхаўся.*

Што і казаць, «прадукт» гэты — вельмі небяспечны. Былі выпадкі, што гусі каштавалі яго ці брагу і падалі мёртвымі. Гаспадыні тады хоць пер'е ўратаваць стараліся — абскубалі іх, а гусі неўзабаве аджывалі, голыя. Во дзе страху было!

А магло б быць і жаху, калі б, крый Божа, і з п'янымі людцамі так.

Менавіта яго, жах (хоць і не такі), убачылі на здымку **спадарыня Валянціна Гудачкова і спадарычна (сямікласніца СШ № 3 г. Вілейкі) Кацярына Якутовіч.** Хто яго пераажыў? Ды вядома ж:

*У бабусі жылі гусі,*
*І каток быў у бабусі.*
*У двары нейк раз гуляў —*
*Гуску з «дзецьмі» напаткаў…*
*Не дала матуля маху —*
*Аж самлеў бядак ад страху, —*
піша спадарыня Валянціна.
*Жылі ў бабусі*
*дробненькія гусі.*
*Аж сямнаццаць немаўлят…*
*Кот Мірон іх з'есці рад:*
*Бач, прыкінуўся, што спіць…*
*Гусака — не абдурыць.*
*Кажа, ўзняўшы галаву:*
*«Псік, бо вушы адарву!»*

І гэта — яшчэ кветачкі, бо гусак і не тое можа зрабіць,

На думку **сужэнцаў Астроўскіх:**

*Спрытна птушак ловіць кот,*
*Ды звязаўся ён не з тымі…*
*Мігам свой адкінуў хвост,*
*Як гусак «намыліў» шыю.*

Трэба, разумець, намыліў добранька? А ўжо як адкінуў… Вы паглядзелі — яшчэ раз? Тады — карціна (ад **спадарыні Марыі Грышчанкі з Дзяржынска**):

*Кот з хаціны выйсці рад —*
*Прагуляўся ўранні.*
*Тут жа згледзеў гусянят:*
*«Будзе мне сняданне».*
*Ды гусак як зашыпіць,*
*Галаву задраўшы…*
*Коцік — брык,*
*як труп ляжыць,*
*Сонцу хвост аддаўшы!*

Зазвычай аддаюць не сонцу… І душу… Ці галаву… Калі маюць. А калі не, як лічыць **спадарыня Кусянкова?**

*Разумны кот абыдзе куранят.*
*Дурны ж —*
*гайда вайной на… гусянят.*
*А там — гусак…*
*Катку у «купал» дзюбай.*
*Той — задні ход.*
*А мог жа даць і дуба!*

Што важна — не толькі ад траўмы «купала»:

*Хтось біклагу асушыў,*
*А на коціка — зваліў…*
*Той ад крыўды занямог*
*І ляжыць без задніх «ног».*
*…Так бывае —*
*хтось нашкодзіць,*
*А віну на іншых зводзіць, —*

піша **спадар Нефідовіч** пра каціную крыўду. **Спадарыня ж Тамара Маркушэўская з вёскі Петкавічы Баранавіцкага раёна,** трэба разумець, пра яго абжорства?

*Пасля доўгае зімы*
*Дачакаўся кот вясны.*
*Выпіў бутлю малака —*
*Аж раздаўся ў баках…*
*Таму гусі з недаверам*
*Абыходзяць таго звера.*

Чаму? Чаго яны баяцца? Аўтарка не тлумачыць. Значыць, пры жаданні, можна дадумаць самім, хоць справа гэта і нялёгкая:

*Пра нейроны — не бяруся,*
*Пра ката ж прамоўлю слова.*
*Жыў раней ён у напрузе,*
*Лавіў мышак адмыслова.*
*А цяпер во — мыш'яком*
*Атруцілі склеп і дом:*
*Так брыдотай там*
*смярдзіць —*
*Васька проста не ўляжыць.*

А таму, паводле **спадара Нефідовіча,** на вуліцы паратунку шукае. І чакае… Чаго? Вядома **спадару Валерыю Гаўрышу з Чавусаў:**

*Кот ляжыць,*
*памыўшы пыску?*
*Значыць, госці*
*недзе блізка…*
*Па дварышчы*
*ходзіць гуска?*
*Будзе файная закуска.*

А наогул, перафразуючы класіка:

*Бач, што робіцца на свеце,*
*Як не роўна дзеліць Бог:*
*Кот — на коўдры,*
*пры катлеце,*
*Гусь — то ў печ, то ў пірог.*

Ды каб толькі, як справядліва зазначае Валерый Мікалаевіч, а то ж:

*Добра гусь у суп які…*
*Смачна — смажыць гузкі…*
*Там, дзе гусі, мужыкі,*
*Файныя падушкі!*

І сапраўды, бо ад іх, ад хатніх птушак, пер'е, ад іх жа — пух. А добрая коўдра і падушка — яны такія: ім чалавека заваліць — што раз плюнуць, асабліва ўзімку.

Таму і шчыруюць гаспадыні…

Адна з іх, як распавядае **спадар Гарачоў,** пасадзіла квактуху. Тая ўзяла ды збегла. І іншай няма… А яйкі стынуць. Вось і ўспомніла кабета пра свайго ката, які толькі тое і рабіў, што днямі і начамі ляжаў — то на печы, то на сонейку. Жанчына за яго ды на тую крушню: гарай, маўляў, не будзе. А вось лепей…

Лепей, кажуць, было! Бо гусяняткі з-пад таго каціная «крыла» выйшлі не толькі здаровыя, але і… бліскучыя! Таму што кожнае з іх (узгадайма анекдот пра язык у ката?..) ён старанна, па-бацькоўску (ці ўсё ж па-мацярынску?) вылізаў. Што рыфмаваным радком апісана так:

*Ну, магчыма, гэта дзіва,*
*А магчыма — байкі,*
*Ды, сцвярджаюць, што садзілі*
*І ката на яйкі —*
*Каб гультайства замяніць*
*Гаспадарскай хваткай…*
*А пасля і палічыць —*
*Сурагатнай маткай.*

З таго ж канверта і так, да слова:

*Ад паклёпаў гусака*
*Гуска часта плакала:*
*На халяву ДНК*
*Толькі ў Малахава.*

Во аж куды занесла ўдзельнікаў конкурсу! Таму самы час закругляцца, і радкі для гэтага ёсць:

*Усё някепска ў нас, панове,*
*Калі ў дом прыйшла*
*«Звязда»,*
*А што кот мышэй не ловіць,*
*Невялікая бяда!*

І сапраўды: грэх не пагадзіцца са **спадаром Гарачовым,** грэх не даравацъ кату, гэтаму міламу боскаму стварэнню… І грэх не падзякаваць усім, хто даслаў свае подпісы да чарговага здымка.

Што да папярэдняга (на ім, нагадаем, група таварышаў на чале з міліцыянерам піхала легкавік), то лепшыя радкі пра каманду дужых (па меркаванні вялікага чытацкага журы) напісалі **спадары Анатоль Гарачоў з Іўеўшчыны, Мікалай Старых з Гомеля, Уладзімір Бурак з Капыля, Валерый Гаўрыш з Чавусаў, спадарыні Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў, Любоў Чыгрынава з Вілейшчыны, Марыя Грышчанка з Дзяржынска, Раіса Васільева з Гомеля…** Яе радкі (даслоўна):

*Бач, прыдумаў што вадзіла,*
*(Не, эксплуататар!):*
*Хоча, каб яго кацілі*
*Аж да самай хаты.*
*Рухавік, бач, не заводзіць…*
*Не дурны — прыкіне,*
*Колькі можна эканоміць*
*На адным бензіне…*

прызнала лепшымі і журы маленькае — рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе квартальнай падпіскі на дарагую (сэрцам) «Звязду» накіроўваецца ў Гомель. Вы хацелі б, каб да вас — у наступны раз? Тады — пішыце. Здымак, як заўжды, дадаецца. Умовы — не мяняюцца: коратка (не больш за 8 радкоў), дасціпна, па-беларуску!

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА**

■



■ Міншчына

# ВЕРНЫЯ АБАВЯЗКУ

**Лепшыя супрацоўнікі органаў унутраных спраў Міншчыны атрымалі ўзнагароды падчас афіцэрскага сходу ў Маладзечне, прымеркаваным да 79-годдзя беларускай міліцыі. Былі адзначаны таксама лаўрэаты акцыі «Вернасць і абавязак». Нагадаю, бронзавыя статуэткі з выявай Архангела Міхаіла ўручаюцца па благаславенні Беларускай Праваслаўнай Царквы работнікам ведамства і грамадзянам, што найбольш праявілі сябе ў ахове правапарадку, барацьбе са злачыннасцю, умацаванні бяспекі.**

Сёлета ў намінацыі «За бескампрамісную барацьбу са злачыннасцю» адзначаны падпалкоўнік міліцыі Сяргей Карась — начальнік аддзела па раскрыцці злачынстваў супраць асобы ўпраўлення крымінальнага вышуку УУС Мінаблвыканкама. Сяргей Уладзіміравіч удзельнічаў непасрэдна ў раскрыцці чатырох невідавочных зламысных забойстваў у Барысаўскім, Мінскім і Пухавіцкім раёнах. У тым ліку замаскіраваных пад прапаўшых без вестак грамадзян.

Маёр міліцыі Аляксандр Самстыка — старшы аператыўны дзяжурны аператыўна-дзяжурнай службы Уздзенскага РАУС — лепшы ў намінацыі «За вернасць службоваму абавязку». Аляксандр Мікалаевіч — адзін з самых вопытных міліцыянераў цэнтральнага рэгіёна: больш за 30 гадоў у органах унутраных спраў. Яго сын Ілья Самстыка таксама служыць ва Уздзенскім РАУС.

Старшы лейтэнант міліцыі Міхаіл Рэўт прайшоў Вялікую Айчынную вайну, пасля служыў у Валожынскім РАУС, выйшаў на пенсію ў якасці ўчастковага інспектара міліцыі аддзялення крымінальнага вышуку. Мае шматлікія баявыя і службовыя ўзнагароды. Сын ветэрана — старшы лейтэнант міліцыі Уладзімір Рэўт — таксама працаваў следчым у Валожынскім РАУС. Тут жа служыць і ўнук, капітан міліцыі Уладзімір Уладзіміравіч Рэўт, оперупаўнаважаны аддзела крымінальнага вышуку. У акцыі «Вернасць і абавязак» сям'я Рэўтаў удастоена ўзнагароды «За працяг слаўных традыцый».

У намінацыі «За ахову грамадскага парадку і прафілактыку правапарушэнняў» адзначаны прапаршчык міліцыі Павел Лыскавец — міліцыянер патрульна-паставой службы Барысаўскага РУУС. Павел Аляксеевіч — прафесіянал сваёй справы: летась асабіста раскрыў 5 крымінальных злачынстваў, выявіў 90 правапарушэнняў.

Лаўрэатам у намінацыі «За ўмацаванне аўтарытэта і асабісты ўклад у развіццё міліцыі Мінскай вобласці» стаў палкоўнік міліцыі ў адстаўцы Аляксандр Балоцін — былы начальнік Упраўлення крымінальнага вышуку УУС Мінаблвыканкама, а цяпер старшыня ветэранскай арганізацыі Мінскай абласной міліцыі. Аляксандр Іванавіч праслужыў у органах унутраных спраў 33 гады. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалём «Ветэран працы».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■


## ДОПОЛНЕНИЯ К ПРОЕКТНЫМ ДЕКЛАРАЦИЯМ

**по объекту «Застройка жилых кварталов с объектами социальной инфраструктуры в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2 очередь строительства). Жилой дом № 18 по генплану»,**
опубликованным в газете «Звязда» № 243 за 27.12.2013, № 6 от 15.01.2014

**Застройщик –** коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Московского района г. Минска» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений и дополнений в проектные декларации «Застройка жилых кварталов с объектами социальной инфраструктуры в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2 очередь строительства). Жилой дом № 18 по генплану», опубликованные в газете «Звязда» № 243 за 27.12.2013, № 6 от 15.01.2014.

**Дополнительно для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются 44 квартиры на 6-8, 22-24 этажах, в том числе:**

- 12 (двенадцать) однокомнатных квартир общей площадью от 45,36 до 45,76 кв.м стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади в размере, эквивалентном **1 550 долларов США;**
- 5 (пять) двухкомнатных квартир общей площадью от 55,5 до 56,2 кв.м стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади в размере, эквивалентном **1 550 долларов;**
- 15 (пятнадцать) двухкомнатных квартир общей площадью от 68,36 до 75,66 кв.м стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади в размере, эквивалентном **1 500 долларов США;**
- 12 (двенадцать) трехкомнатных квартир общей площадью от 93,1 до 93,9 кв.м стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади в размере, эквивалентном **1 450 долларов США.**

**Условия оплаты –** первоначальный взнос в размере 30% стоимости объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – в течение 12 месяцев в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

При **единовременной** оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение **30 (тридцати) календарных дней** со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную **50 долларам США по 2-комнатным квартирам общей площадью 68,36-75,66 кв.м и 100 долларам США по 3-комнатным квартирам.**

Стоимость 1 кв.м общей площади фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора. Стоимость 1 кв.м. общей площади квартир указана без учета выполнения внутренних отделочных работ.

Оплата производится в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату оплаты.

**Для заключения договоров необходимы:**

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор.

Документы для заключения договоров будут приниматься с 12.03.2014. Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и государственное предприятие «УКС Московского района г.Минска» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованной ранее.

**Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу:** г. Минск, ул. Короля, 20, каб. 2.
**Тел. (017) 200 06 85, (044) 795 44 44.**
Сайт компании: www.uks-m.by.



УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ!
Открытое акционерное общество
**«Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин**
извещает акционеров о проведении 25 марта 2014 года в 14.00 очередного общего собрания акционеров по адресу: г. Кобрин, ул. Советская, 109, зал заседаний.

**Повестка дня общего собрания:**

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Гидромаш» г. Кобрин за 2013 год. Утверждение показателей социально-экономического развития ОАО «Гидромаш» г. Кобрин на 2014 год.
2. Отчет наблюдательного совета ОАО «Гидромаш» г. Кобрин о проделанной работе в 2013 году.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности, распределения прибыли и убытков ОАО «Гидромаш» г. Кобрин за 2013 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках ОАО «Гидромаш» г. Кобрин за 2013 год.
5. Об утверждении распределения и использования прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2013 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли на 2014 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета, его составе и ревизионной комиссии ОАО «Гидромаш» г. Кобрин.
8. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Гидромаш» г. Кобрин.
9. О внесении изменений в устав ОАО «Гидромаш» г. Кобрин.
10. Об утверждении органа печати ОАО «Гидромаш» г. Кобрин.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 13.00 до 13.45 в день и по месту проведения собрания на основании: акционер – паспорт; представитель – паспорт и доверенность, оформленная в соответствии с постановлением Совете Министров Республики Беларусь от 30 августа 2006 г. №1093 «Об утверждении Инструкции о порядке регистрации доверенностей, предусматривающих передачу прав, удостоверенных акциями».

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании реестра акционеров по состоянию на 1 марта 2014 г.

УНП 200093330 **Наблюдательный совет**



Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу серии БЛБ № 0780237 **считать недействительным.** УНП 100122726



## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту **«Многоквартирный жилой дом по генплану №3 со встроенно-пристроенными объектами общественного назначения по пр. Победителей в границах жилого района Лебяжий»,**
опубликованную в газете «Звязда» 29.11.2013 года

**Застройщик:** Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, дом 21А, помещение 3, каб. 4, 6.
**Тел. 8 (017) 216 00 09, 8 (029) 654 10 10.**

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются** машино-места в двухуровневой подземной гараж-стоянке стоимостью 20010 долларов США.

Стоимость неизменна до окончания строительства. Оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей. УНП 100070331



## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ АУКЦИОНЕ

по продаже штукатурной станции УШОС-6
**ОАО «Стройтрест №3 Ордена Октябрьской революции»**

| | |
|---|---|
| **Штукатурная станция УШОС-6** | Штукатурная станция УШОС-6, вместимость бункера 2,5 л, дальность подачи по вертикали 40 м, дальность подачи по гриз. 200 м, производительность 4…6 куб. м/ч, способ перемешивания – циклического действия, тип насоса – поршневой, 1990 года выпуска |
| **Место нахождения объекта** | г. Солигорск, переулок Строителей, 6 |
| **Начальная цена продажи** | 30 120 000 (тридцать миллионов сто двадцать тысяч) белорусских рублей с учетом НДС 20% |
| **Сумма задатка** | 3 012 000 (три миллиона двенадцать тысяч) белорусских рублей с учетом НДС 20% |
| **Продавец** | ОАО «Стройтрест №3 Ордена Октябрьской революции» |
| **Организатор торгов** | ОАО «Стройтрест №3 Ордена Октябрьской революции», г. Солигорск, ул. Козлова, 37, 223710 |
| **Условие оплаты** | 100% предоплата |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | 3012100001011 в ОАО «Приорбанк» ЦБУ 104 г. Солигорск, ул. Богомолова, 16а, код 749, УНП 600122771 |

**Аукцион состоится 7 апреля 2014 г. в 10:00 по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, 3 этаж.**

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются** в рабочие дни до 07.04.2014 г. с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, 3 этаж, юридическая служба.

**Регистрация участников аукциона** 7 апреля 2014 г. с 9:00 до 10:00 по месту проведения аукциона.

**Контактное лицо:** Волчек Станислав Александрович 8 (017) 22 55 34.

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах** оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.str3.by.

**+375 (17) 22 55 34, 22 55 36.**



Извещение. **ОАО «Нафтан»** реализует на конкурсной основе
(с повышением начальной цены)
бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:

| Пометка на конверте | Наименование | Инв.№/ Ном.№ | Год выпуска | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|
| 1. Реализация неликвидов. Мотоблок. | Мотоблок Беларус-09Н | 4150909 | 2006 | 23 100 000 |
| | **Навесное оборудование, реализуемое в комплекте с мотоблоком Беларусь-09Н (инв. №04150909)** | | | |
| | Прицеп мотоблочный | 06268279 | 2006 | |
| | Фреза почвенная ФР-00010 | 06268280 | 2006 | |
| | Снегоочиститель к мотоблоку | 06268281 | 2006 | |
| | Сцепка универсальная к мотоблоку | 420200 | 2006 | |
| | Плуг универсальный ПУ-00.000-01 | 420201 | 2006 | |
| | Культиватор КТ-00010-Б | 420203 | 2006 | |
| | Отвал к мотоблоку | 420199 | 2007 | |
| 2. Реализация неликвидов. Трактор. | Трактор Т-25, гос.№ БЯ 9994 | 04150072 | 1994 | 42 000 000 |
| 3. Реализация неликвидов. Прицеп. | Прицеп тракторный ПСЕ-Ф, гос. №7823 ВМ | 06250880 | 1992 | 13 200 000 |
| 4. Реализация неликвидов. Зил. | Автомобиль ЗИЛ-5301, гос.№ ВЕ 87-46 | 13150625 | 2002 | 30 150 000 |

**Состояние удовлетворительное.**
**Предложения принимаются по адресу:** 211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101 до 10 апреля 2014 года с соответствующими пометками на конверте, указанными в таблице.

Извещение на проведение конкурса размещено на сайте www.naftan.by.

**КОНТАКТНЫЕ ТЕЛЕФОНЫ: 8 (0214) 59 87 83, 8 (0214) 59 89 26, 8 (0214) 59 88 42, 8 (033) 398 08 48, 8 (033) 398 07 67.** УНП 300042199



**НОВОПОЛЬСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
Пуховичского района Минской области
**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**
по продаже земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов гражданам Республики Беларусь, расположенных на территории сельсовета

| № лота | Адрес земельного участка кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Замостье, ул. Центральная, 33 624484003601000072 | 0,1490 | Сети электроснабжения | 5 890 790 | 13 200 000 | 2 640 000 |
| 2. | д. Гребень, 624484002101000119 | 0,1491 | Сети электроснабжения | 5 779 780 | 16 900 000 | 3 380 000 |
| 3. | д. Культура 624484004601000045 | 0,1077 | Сети электроснабжения | 5 700 100 | 11 200 000 | 2 240 000 |
| 4 | д. Осока, ул. Поселковая 624484005601000161 | 1,1391 | Сети электроснабжения | 5 779 800 | 13 200 000 | 2 640 000 |

Задаток перечисляется на р/с № 3604625110018 в ЦБУ № 626 г. Марьина Горка, ф-л № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк» в 222810 г. М. Горка, ул. Ленинская, 27, БИК 153001601, УНН 600177772, ОКПО 04429639, Код платежа 04901, Новопольский сельисполком.

**Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении.**

**Аукцион состоится** 28 марта 2014 года в 10.00 по адресу: аг. Новополье, ул. Центральная, 21 (здание исполкома) Пуховичского района Минской области.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25 марта 2014 года до 17.00 по вышеуказанному адресу.

**Телефон (8 017 13) 3 03 16, 3 03 35.**
Сайт Пуховичского райисполкома: www.pukhovichi/minsk-region.by.